Сяржук Сыс



...Часам – маці родная,
часам– баба хцівая...
Ды якая ёсьць ужо – ёсьць яна,
Р-а-дз-і-м-а!...

# Залацісты цмок

## РАДЗІНА

Пытаюцца: “Што ж Радзіме
Не прысьвяціў свой верш?”
Яна ж мне адно – Радзіна,
З якой не памрэш.

Якая ў жвірах спачыла
На кручах, па-над Дняпром,
Якая ў ліхім разьліве –
Мой цудадзейны паром!

Якая ў ГУЛАГах канала,
Касьцямі мосьцячы гаць,
Ды ёсьць каму вершы Купалы
Сёньня чытаць.

А колькі ў вайну пабіта!
Ды ўсё ж чапляла хамут,

Каб залацелі жытам
Балоты ды груд.

Няхай бульбяным лушпіньнем,
Ды маладой крапівой
Часам карміла сына…
Радзіна, я твой!

Крычаць пра любоў ня буду –
Аддзячу табе, калі
Укрыюся мяккім грудам
Радзімай сваёй зямлі.

## ЗАЛАЦІСТЫ ЦМОК

“Хай вылупіцца аранжава-залацісты
цмок. Мы ўсе зачакаліся”.
*Ева Вежнавец*
“Цмок – заступнік беларусаў…”
*Людзі кажуць*

Ева, верыш, вылупіўся Цмок,
Ды ня з яйка чорнага – з Сажа,
Залацісты, выпаўз на пясок,
На ўзьбярэжжы вольна паляжаць.

У пясок угрузьлі кіпцюры,
Што зубрам распорвалі бакі,
А ў вачох – і цьмяныя віры,
І лагодны ліпеньскі блакіт.

Крэўны, наш, разьлёгся ля вады,
У самоце: ведама ж, адзін.
Ды на Еў палюе маладых
Можа быць апошні Цмокаў сын.

А ўначы, спачыўшы, паляцеў
У агнях і велічы грымот,
Адшукаць сапраўдных каралеў,
Каб ня зьнік тутэйшых цмокаў род.

Кажуць людзі, што бароніць ён
Свой абшар пад шатамі аблок,
Што яшчэ народзіцца дзіцё –
Залацісты беларускі Цмок.

## ПАДАРОЖЖА Ў ЗІМУ

Падарожжа ў зіму пачынаецца ў высьмяглым жніўні,
Калі мроіцца сьнег, а нябёсы працялі рагаціны дрэў,
Нібы шнары ад драпінаў, што сакавік прычыніў мне…
“Мне білет да зімы! Я так цяжка бяз сьнегу хварэў.”

Разьдзімаючы ноздры, ля Сьвіслачы песьціць чаканьне
Хрумсткіх шкельцаў, яшчэ не рашчаўленых днём-немаўлём,
Прачынацца, глядзець у вакно і скрозь шкло партызаніць
За разьведбатальёнам зімы, што бязбоязна прэ напралом.

І ня ўбачыць пачатку атакі, якая парушыць
Сытых вуліц і плошчаў, апухлых ад сну, статус кво.
Замяце гэты чортавы горад па самыя вушы
Хоць на зыбкую ноч першабытнай віхуры сяйво.

Вось і ўсё… Ціхамірна палягуць сьнягі над Нямігай,
Твой білет – несапраўдны,
                    і зьняты з маршруту зваротны цягнік…
Падарожжа ў зіму перапыніць раптоўна адліга,
За якой – Вызваленьне, Кастрычніцкі пляц, Сакавік.

## МОЖНА СЕСЬЦІ

Можна сесьці на брудны кардон ля ўваходу ў метро
Лепш каля “Інстытуту культуры”, а не – дык ”Нямігі”,
І ў падраны пакет, капялюш ці, наогул, вядро
Падаяньне зьбіраць, апрануўшы рызьзё забулдыгі.

Памаліцца на літасьць разьюшанага патруля,
Што нахабна зьдзірае з падлеткаў чырвоныя крылы,
Падлічыць вашу шчодрасьць і скласьці рубель да рубля,
Каб затым скіравацца туды, дзе “свабода – “чарнілу!”

Перайсьці праз масткі на будоўлю, каб там лоб у лоб,
З важаком аднавокім свабоднае зграі сабачай,
Піць з нямытае шклчнкі “Лясьнічага зоры” ўзахлёб
І сярод рубероіду скурчыцца ў радасным плачы.

Гэта ўсё ірэальна, але верагодна,
Як захочаш напоўніцу дыхаць свабодай!

* * *

Рэечкі парыпваюць, а ў купэ – задуха,
За вакном жа краявід – наскі, не чужы.
Вызваліўшы гузікі на кашулі, слухаю,
Як зямля радзімая пада мной дрыжыць.

Часам – маці родная, часам– баба
хцівая...
Ды якая ёсьць ужо – ёсьць яна,
Р-а-дз-і-м-а!

* * *

Пэўна мікроб разьядае мне сэрца?
Пэўна стаміўся і трэба памерці?
Можа тады прарастуць, нібы сьведкі,
Праўды жыцьця неўміручыя кветкі.

* * *

Пра цябе я стаміўся думаць,
Толькі ў памяці ты, як верш:
Лёгкім воблакам вечнага суму
Скрозь бяссонную ноч плывеш…

* * *

Хутка тут,
Між абрыдлых
Дамоў гарадскіх,
Паўзадушаных хваткай
Бязьлітасных вуліц,
З-пад асфальту ўзаўецца
Зямля на дыбкі,
І надзеяй мяне,
І пяшчотай атуліць.

## ДЫМ

Дым адносін,
Дым крадзеных слоў,
Сноў дым –

У кватэры сярод чужых,
Дзе штодня па твары маім
Прапаўзаюць хлусьні смаўжы.
Гэты дом
І вар’яцтва шпалер,
І такі-сякі дабрабыт…
Сярод іх мы, здаецца, жывём,
А, дакладней, жыве нябыт.
Не праз вочы вакон,
Дым густы,
Непраглядны, нібыта сон,
Не праз сэрца са мною ты,
А з табою прыйшоў і ён –
Поўны самай зямной нуды
Пракаветны халодны дым.

## РУСАЛЧЫНЫ СЬЛЁЗЫ

Сядзела русалка на белай бярозе,
Ой, рана на белай, ой, рана сядзела,
Губляла ў лісточках зялёныя сьлёзы,
Ой, рана губляла, ой, рана на белай.

Зьвісалі да долу халодныя косы,
Ой, рана зьвісалі, чакалі вяночка,
Русалчыны сьлёзы палеглі як росы,
Ой, рана каціліся чэрвеньскай ночкай.

Шапочуць наўзбоч залатыя палосы,
Ой, рана шапочуць, ой не на Купальле,
А з белай бярозы няўцешныя сьлёзы
Ой, рана смарагдамі ў травы сьцякалі.

Ня мчаць агнявыя калёсы з пагоркаў,
Ой, рана, дзяўчаты вяночкаў ня зьвілі,
Зьляці лепш з бярозы зязюльчыным пёркам,
Схавайся ў забытай магіле.

*   *   *

Божа,
каб мог ты вярнуць,
што калісьці са мною было:
з жахам зьбягаю па схіле,

здаецца, бяздоннае кручы.
Вецер
і сьлёзы ў вачах,
і нага над бутэлечным шклом…
Памяць дзяцінства –
край неба…
трыпутнік крывавы…
балюча…

* * *

Новы дзень размалюе па-новаму
Звыклы шэраг падзей і сустрэч,
Шэрань здасца ў палон ружоваму,
І адыдзе разважлівасьць прэч.

Разарвецца бадзёрым клічнікам
Учарашні занудлівы сум,
З маладым бесшабашным кастрычнікам
Будзем срэбную піць расу.

А нап’емся – па хрусткай чырвані
Закарціць нам удвух шамацець
У ружовае і немагчымае,
Што магчымым стане на ледзь...

**СВАБОДА**

Ёсьць свабода пайсьці адсюль
Безаглядна, на ўсе бакі,
Проста зьнікнуць, сысьці на нуль,
Як шуга па плыні ракі.
Ёсьць свабода глухім нямком,
Невідушчай дзённай савой,
Не пачуць, як бацькоўскі дом
Аплятае хлусьні павой.
Ёсьць свабода займець сяброў,
Што цябе, як піць даць, здрадуць,
З насалодаю пусьцяць кроў,
Ды на могілках адпяюць.
Ёсьць свабода… Ці зьлічыш сам,
Колькі хто тут мае свабод?
Толькі праўды вось на сто грам,
Ды і то не ва ўласны рот...

## NIHIL

Больш за больш,
Больш за боль
Больш чым жах –
Калі думкі
Хаваюцца ў словах,
Калі словы
Ня болей чым прах,
Калі прах
Гэта толькі выснова:
“Як ёсьць ты – ёсьць імя,
Ад імя ёсьць *няма*”.
Больш ня больш
Чалавек ад народзін
За нішто, за балота,
За боль, за падман,
Бо чым боль
Больш ня зьведаў ніводзін.
Праз дрыгву і балоты
Народжаных слоў
Прыйдзеш зноў
У нішто, у самоту.
Жах зьбірае імёнаў
Спрадвечны улоў,
А імёны – што мёд,
Толькі ў сотах.
І *няма* родзіць жах
Родзіць боль і імя
Іх адсутнасьць –
Біблейская цнота.
Толькі ў словах
Ёсьць існасьці знак
Асязальна-самотнае:
Хто ты?